// БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 25 лютага 1999 года, чацвер, № 3 (1795)

ВІНШУЕМ!

# ЗОРКІ НА ПАГОНАХ ПАЛКОЎНІКА ТАЛЯРОНКА



Віктар Уладзіміравіч Таляронак у 1972 годзе паступіў на геаграфічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Пасля заканчэння служыў у войску. Далей — падпалкоўнік, начальнік цыкла праваой, выхаваўчай работы і падрыхтоўкі хімічных войск ваеннай кафедры БДУ. Ён прафесійна валодае ўсімі перадавымі тэхналогіямі навучання і выхавання, заўсёды стрыманы, добразычлівы.

Напярэдадні Дня абаронцы Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь міністрам абароны Рэспублікі Беларусь падпалкоўніку Віктару Уладзіміравічу Таляронку прысвоена чарговае воінскае званне — палкоўнік. Яму ўрачыста былі ўручаны новыя пагоны, на кожным — па тры вялікія зоркі. Саслужыўцы і супрацоўнікі, студэнты шчыра віншуюць Віктара Уладзіміравіча. А ягоным сынам Аляксандру і Васілю, дарэчы, студэнтам БДУ, гэта дастойны прыклад для пераймання.

*На фотаздымку:* палкоўнік В.У. Таляронак

*Анатоль КОНАНАЎ, дацэнт ваеннай кафедры БДУ*

ШТО НОВАГА?

# Фундаментальная бібліятэка БДУ — дэпазітарная бібліятэка ААН

Статус дэпазітарнай бібліятэкі ААН прысвоены фундаментальнай бібліятэцы Белдзяржуніверсітэта. Яна стала часткай міжнароднай сеткі з 365 бібліятэк у 141 краіне, якія прадастаўляюць дакументы і публікацыі ААН карыстальнікам ва ўсім свеце.

Гэта стала магчымым дзякуючы дзейнаму праекту "Стварэнне цэнтра па вывучэнню ААН" пад эгідай ПРААН, Упраўлення Вярхоўнага камісарыята па справах уцекачоў ААН у Беларусі і Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Цяпер у нашай краіне з'явіўся яшчэ адзін канал атрымання ўсебаковай інфармацыі аб мэтах і ідэалах ААН, уключаючы пытанні міжнароднай бяспекі, эканамічныя, сацыяльныя, гуманітарныя...

Больш падрабязна чытайце аб гэтай падзеі на 2-й старонцы гэтага нумара "Беларускага універсітэта".

НАПЯРЭДАДНІ

# СПЕЦЫФІКА ЖАНОЧАЙ САМААБАРОНЫ

Па-свойму падрыхтавалася да жаночага свята Беларуская асацыяцыя маладых хрысціянскіх жанчын. Яе арганізатары ўпэўнены, што прыгожая палова чалавецтва мае патрэбу не столькі ў кампліментах, якія выказваюцца дзяжурна і абавязкова раз у год, колькі ва ўменні абараніць сябе ад насілля.

У межах праекта "Насілле ў адносінах да жанчыны як сацыяльная праблема" асацыяцыя аб'явіла набор у групу дзяўчат па навучанню жыццю без насілля. На сустрэчах будуць абмяркоўвацца такія праблемы, як сексуальнае насілле, спецыфіка жаночай самаабароны, псіхалагічнае насілле, працаўладкаванне маладых жанчын.

Акцыю "Тыдзень без насілля над жанчынай" Беларуская асацыяцыя маладых хрысціянскіх жанчын таксама праводзіць у рамках названага праекта, які ажыццяўляецца пры падтрымцы Прадстаўніцтва ААН у Рэспубліцы Беларусь і Цэнтра гендэрнай інфармацыі і палітыкі Міністэрства сацыяльнай абароны. Між іншым, з 1 па 5 сакавіка ўсе, хто мае патрэбу, могуць атрымаць бясплатныя кансультацыі псіхолага і юрыста (тэл. 2102111), а 1, 3, 5 сакавіка — яшчэ і авалодаць прыёмамі фізічнай і псіхалагічнай самаабароны ў трэнінгавых групах.

ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

# ВЫДАТНІКІ ТРЫМАЮЦЬ МАРКУ

Ва універсітэце падведзены вынікі зімняй экзаменацыйнай сесіі. Пра гэта начальнік навукова-вучэбнага аддзела Ірына Пятроўна Латушка расказала карэспандэнту "Беларускага універсітэта" больш падрабязна. Так, па словах Ірыны Пятроўны, паспяховасць у БДУ ў параўнанні з мінулагодняй зімовай сесіяй не змянілася і складае каля 85 %. Гэта сярэдні паказчык для БДУ за апошнія шэсць гадоў. Што да паспяховасці на факультэтах, то аказалася, што найлепш сесію здалі студэнты геаграфічнага факультэта (паспяховасць складае 89,9 %), на другім месцы — студэнты хімічнага факультэта (89,4 %), на трэцім — пакуль філфак (89 %), але яшчэ не вядома, як здадуць экзамены пяцікурснікі філфака (для іх сесія пройдзе ў сакавіку). Цалкам магчыма, што ФЭФ іх перагоніць (88,2 %).

Найгорш паказалі сябе студэнты біяфака: іх паспяховасць ніжэй за сярэднюю па БДУ — 78,9 %. Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі таксама набраў толькі 81,2 %, паспяховасць на механіка-матэматычным — 82,1 %, на факультэце міжнародных адносін — 82,6 %. Трэба заўважыць, што традыцыйна студэнты гуманітарных факультэтаў здаюць сесію крыху лепш — на гэты раз яны перагналі студэнтаў прыродазнаўчых факультэтаў на 2 %. Пяцікурснікі таксама паказваюць лепшыя вынікі, чым студэнты малодшых курсаў.

Больш падрабязнага аналізу заслугоўваюць студэнты першых курсаў, асабліва медалісты, выпускнікі ліцэя, пераможцы алімпіяд і платнікі. Першая сесія для іх — гэта не проста чарговыя экзамены, да якіх студэнты старэйшых курсаў ужо прызвычаіліся. Гэта своеасаблівая праверка ўзроўню і трываласці іх ведаў. Што тычыцца студэнтаў-платнікаў, то іх паспяховасць не вельмі высокая і складае каля 76 %. Паспяховасць сярод медалістаў, ліцэістаў, пераможцаў алімпіяд складае каля 95 %. Гэта даволі высокі паказчык. Самыя лепшыя вынікі на ФЭФ: усе гэтыя тры катэгорыі студэнтаў набралі па 100 %. Увогуле, выпускнікі ліцэя і пераможцы алімпіяд амаль на ўсіх факультэтах паказалі высокі ўзровень — 100 %.



**Навукова-даследчы інстытут прыкладных фізічных праблем імя А. М. Сеўчанкі аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

— навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці фізіка цвёрдага цела (2);

— малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці акустыка.

Тэрмін конкурсу — месяц з дня апублікавання аб'явы.

Дакументы накіроўваць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. 277-56-17, 277-48-43.

**Навукова-даследчы інстытут прыкладных фізічных праблем імя А. М. Сеўчанкі аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці інфарматыка, вылічальная тэхніка і аўтаматызацыя.**

Тэрмін конкурсу — месяц з дня апублікавання аб'явы.

Дакументы накіроўваць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. 277-56-17, 277-48-43.

ШТО НОВАГА?

# БІБЛІЯТЭКА БДУ АТРЫМАЛА СТАТУС ДЭПАЗІТАРНАЙ БІБЛІЯТЭКІ ААН

Напачатку лютага група ў складзе прарэктара па міжнародных сувязях БДУ Уладзіміра Аркадзьевіча Астапенкі, загадчыцы аддзела камплектавання і каталагізацыі фондаў Фундаментальнай бібліятэкі БДУ Алы Вячаслаўнай Буцінай і адміністратара Цэнтра па вывучэнню ААН Андрэя Уладзіміравіча Селіванава наведала бібліятэку імя Дага Хамаршэльда ў Нью-Йорку. Гэтая паездка была наладжана з нагоды надання Фундаментальнай бібліятэцы БДУ статусу дэпазітарнай бібліятэкі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Мэты паездкі — асабіста пазнаёміцца з кіраўніцтвам Бібліятэкі імя Дага Хамаршэльда, прайсці спецыяльную вучэбную стажыроўку па пытаннях арганізацыі фонду матэрыялаў Арганізацыі Аб'яднаных нацый, пазнаёміцца і папрацаваць з электроннымі крыніцамі інфармацыі аб дакументацыі ААН: сістэмай бібліяграфічнай інфармацыі ААН (ЮНБІС), сістэмай на аптычных дыскетах (СОД), дакументамі ААН у сістэме Інтэрнэт.

Асноўная функцыя Бібліятэкі імя Дага Хамаршэльда ў забеспячэнні бібліятэчнымі матэрыяламі і інфармацыяй членаў дэлегацый, супрацоўнікаў Сакратарыята і іншых афіцыйных груп ААН.

Пачынаючы з 1946 года, гэтая бібліятэка распаўсюджвае дакументы і публікацыі ААН на ўвесь свет праз сваю сістэму бібліятэк — дэпазітарыяў. На сёння налічваецца 365 дэпазітарных бібліятэк ААН: 53 знаходзіцца ў краінах Афрыкі, 99 — у краінах Азіі і Акіяніі, 32 — ва Усходняй Еўропе, 84 — у Заходняй Еўропе, 46 — у Лацінскай Амерыцы і Карыбах, 53 — у Паўночнай Амерыцы.

Краіны — члены ААН, а таксама краіны, якія не з'яўляюцца яе членамі, маюць права карыстацца паслугамі аднаго бясплатнага дэпазітарыя, звычайна — нацыянальнай бібліятэкай. Іншыя бібліятэкі-дэпазітарыі робяць сімвалічны грашовы ўзнос для атрымання дакументаў ААН. Адбор дэпазітарыяў знаходзіцца ў кампетэнцыі Выдавецкай калегіі ААН, ажыццяўляецца па рэкамендацыі дырэктара Бібліятэчна-выдавецкага аддзела Дэпартамента грамадскай інфармацыі. Адным з крытэрыяў адбору служыць узровень развіцця бібліятэк, ад якіх паступіла просьба, а таксама агульнае геаграфічнае размяшчэнне бібліятэк-дэпазітарыяў у зацікаўленых краінах.

З сакавіка 1998 года Прадстаўніцтва ААН (ПРААН) у Рэспубліцы Беларусь сумесна з БДУ ажыццяўляе праект "Стварэнне Цэнтра па вывучэнні ААН". Адным з галоўных мерапрыемстваў праекта з'яўляецца стварэнне бібліятэкі-дэпазітарыя дакументаў ААН на базе Фундаментальнай бібліятэкі БДУ.

Да 1998 года ў Беларусі дзейнічала адна бясплатная дэпазітарная бібліятэка ААН — у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. 15 снежня 1998 года Дэпартамент грамадскай інфармацыі ў Цэнтральных установах ААН прызначыў Фундаментальную бібліятэку БДУ другой дэпазітарнай бібліятэкай і 365-й у сістэме дэпазітарыяў ААН, якая, заплаціўшы грашовы ўзнос, будзе атрымліваць абавязковы экземпляр дакументаў і публікацый ААН.

Паставка дакументаў у бібліятэку пачнецца з моманту прызначэння яе дэпазітарыем. Усё будзе пастаўляцца ў адным экземпляры.

Фундаментальная бібліятэка БДУ будзе атрымліваць частковы камплект дакументаў і публікацый ААН. У яго будуць уключаны:

1. Афіцыйныя справаздачы галоўных органаў ААН. Гэта стэнаграфічныя і кароткія справаздачы Генеральнай Асамблеі і яе галоўных Камітэтаў, Савета Бяспекі, Эканамічнага і Сацыяльнага Савета, Савета па Апецы і Савета па гандлю і развіццю ЮНКТАД.

2. Публікацыі з тавconfigurarным кодам, прызначаныя для продажу. Гэта штогоднік, асноўныя даклады і даследаванні, матэрыялы канферэнцый і некаторых семінараў і сімпозіўмаў ААН.

3. Перыядычныя выданні, якія распаўсюджваюцца па падпісцы.

4. Зборнікі дагавораў ААН.

Усе вышэйпералічаныя дакументы бібліятэка будзе атрымліваць на англійскай мове, а таксама адзін экземпляр кожнага выдання, які ёсць на рускай мове.

Дэпазітарная бібліятэка дакументаў ААН будзе знаходзіцца ў аддзеле абслугоўвання факультэта міжнародных адносін і захоўвацца там асобна ад агульнага бібліятэчнага фонду.

Статус дэпазітарыя ААН будзе патрабаваць ад Фундаментальнай бібліятэкі БДУ выканання пэўных абавязкаў па арганізацыі фонду, пра якія гаворыцца ў "Інструкцыі для дэпазітарных бібліятэк ААН", выдадзенай Сакратарыятам ААН.

Ад бібліятэкі чакаюць наступнае:

1. Вылучэнне кваліфікаванага бібліятэчнага персаналу для ўліку і апрацоўкі дасыланых матэрыялаў, падтрыманне іх у парадку і забеспячэнне публічнага доступу да іх.

2. Прадастаўленне захоўваемых адзінак па міжбібліятэчнаму абанементу альбо ў выглядзе фотакопій, ксеракопій тым кліентам, у раёне іх дзеяння, для якіх наведванне адпаведнай бібліятэкі-дэпазітарыя звязана з цяжкасцямі.

3. Аказанне Бібліятэцы імя Дага Хамаршэльда на яе патрабаванне бібліяграфічнай дапамогі, забеспячэнне яе, у выпадку неабходнасці, публікацыямі, якія бібліятэка-дэпазітарый распаўсюджвае бясплатна ў парадку кнігаабмену.

4. Запаўненне анкеты, якая кантралюе выкананне ўмоў атрымання і захоўвання абавязковага экземпляра (кожныя два гады).

У іншым выпадку накіраванне дакументаў перапыняецца. Бібліятэкары-прафесіяналы і супрацоўнікі службы інфармацыі ААН перыядычна будуць наведваць бібліятэку-дэпазітарый, дапамагаць, праводзіць інструктаж і кантраляваць стан фонду дасыланых дакументаў. Пры наяўнасці фактаў нездавальняючага выканання ўмоў атрымання абавязковага экземпляра Выдавецкая калегія пакідае за сабой права пазбавіць бібліятэку статуса дэпазітарыя альбо перадаць яго іншай бібліятэцы ў тым жа раёне.

*А. В. БУЦІНА, загадчыца аддзелам камплектавання і каталагізацыі фондаў Фундаментальнай бібліятэкі БДУ*

# КАМЕННЫ ХРАМ

## *Найбуйнейшы ў Беларусі метадычны цэнтр па вывучэнню камянёў знаходзіцца ў БДУ*

На геаграфічным факультэце Белдзяржуніверсітэта знаходзіцца дзіўны "каменны храм", які ўвесь час выпраменьвае чароўнае святло таямнічага каменнага царства. Называюць гэты храм музеем землязнаўства. Яго можна параўнаць з чароўнай скарбонкай, запоўненай ізумрудамі, агатамі, хрызапразамі, малахітамі і іншымі каштоўнасцямі. Кожны, хто прыходзіць сюды, не застаецца абыякавым, таму што камень кранае душу не толькі сваёй прыгажосцю, але загадкавасцю і таямнічай сілай, што закладзена ў яго існасці.

Ад старажытных часоў камень трывала ўвайшоў у жыццё чалавека: ён быў прыладай працы, карысным выкапнем, упрыгожаннем. Кожны камень мае сваю гісторыю, свой шлях ад былога да сучаснасці. Бескарысных камянёў увогуле няма, таму нават самы просты з іх можа растлумачыць нейкія з'явы прыроды, можа адказаць на розныя пытанні ў шчырым пошуку пры набыцці ведаў.

У музеі налічваецца больш за 15 тысяч узораў камянёў, асноўная частка якіх сабрана ў 50-х гадах сіламі супрацоўнікаў і студэнтаў. З моманту свайго заснавання ў 1923 годзе музей ператварыўся ў буйнейшы метадычны цэнтр па вывучэнню камянёў. Гэта яшчэ і кансультацыйны цэнтр, дзе можна атрымаць кваліфікаваныя адказы на ўсе пытанні наконт старажытных утварэнняў Зямлі. Пасля праведзенай у 1991 годзе карэннай рэканструкцыі ён стаў даступны для розных наведнікаў. Акрамя заняткаў са студэнтамі геаграфічнага факультэта, у музеі вядзецца работа са студэнтамі хімічнага, біялагічнага, фізічнага, гістарычнага і іншых факультэтаў універсітэта. Адпаведна з вучэбнымі планамі многіх вышэйшых навучальных устаноў (педуніверсітэт, Політэхнічная акадэмія, тэхналагічны, эканамічны і універсітэт культуры, медыцынскі інстытут) распрацавана тэматыка спецыяльных экскурсій. Музей наведваюць навучэнцы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў (індустрыяльных, педагагічных, архітэктурна-будаўнічых і інш.).

У музеі землязнаўства сфарміравалася сістэма павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. На спецыяльных семінарах выкладчыкаў турысцка-экскурсійных і экалагічных службаў праводзіцца вывучэнне мінералаў і горных парод, іх распаўсюджанне ў прыродзе, выкарыстанне чалавекам. Паслугамі музея карыстаецца пракуратура і мытная служба.

Музей — актыўны арганізатар і ўдзельнік мінералагічных выстаў. Праведзена ўжо 9 міжнародных выстаў "Каменная казка", больш за дзесяткі выстаў "Таямнічы свет камянёў" у Мінску і іншых гарадах Беларусі, а таксама Расіі, Малдовы, Польшчы. Сёлета ў канцы сакавіка (26-28 сакавіка) плануецца правесці дзесятую міжнародную мінералагічную выставу "Каменная казка".



Музей зарэгістраваны ў міжнародным "Word direktor of Mineral collections". Па выніках выстаў 5 мастакоў атрымалі ганаровае званне "Народны майстар". Акрамя мінералагічнай калекцыі, у музеі створаны аддзелы "Зямля як планета", "Геалогія і карысныя выкапні Беларусі", "Касмічная прастора", "Гісторыя развіцця жыцця на Зямлі", "Выкарыстанне прыродных багаццяў" і іншыя. Сюды прыходзяць вучні любога ўзросту. Кваліфікаваныя спецыялісты ў адпаведнасці з праграмамі школы і ўзроўнем агульнай падрыхтоўкі вучняў праводзяць экскурсіі, выхаваўчыя мерапрыемствы, паседжанні геалагічных гурткоў, канферэнцый, якія даюць агульнае ўяўленне аб Зямлі.

Такім чынам, музей з'яўляецца асветніцкім цэнтрам у галіне прыродазнаўчых навук. Прыходзьце ў музей, і вас зачаруе дзівосная гармонія і недасяжная прыгажосць таямнічага свету, дзе квітнеюць "каменныя" фіялкі — аметысты, дзе самая прыгожая майская зеляніна ізумрудаў, малахітаў, хрызапразаў, дзе струменіцца бэзавы туман чараіта. У музеі можна сагрэцца іскрыстым сонечным праменьчыкам бурштыну, вывучыць цудоўную калекцыю кварца (у музеі амаль тысяча ўзораў, адзін крышталь-гігант важыць паўтоны), пазнаёміцца з разнастайнымі кальцытамі, нефрытамі, флюарытамі і г.д. Заварожваюць погляд высакародныя апалы, непаўторныя кветкі астрафіліту, "ружы" з гіспу. Прыцягальна вабяць мінералы завоблачных памірскіх вышыняў — лазурыты. Гонарам музея з'яўляецца калекцыя агатаў з радовішчаў Чукоткі, Манголіі, Бразіліі, Урала, Сібіры і іншых месцаў.

*В. Л. СМАЛЯКОВА, геолаг 1-й катэгорыі*

ГОСЦІ



## СУСТРЭЧА З ПАЭТАМ

9 лютага ў галоўным корпусе БДУ адбылася літаратурна-творчая сустрэча з вядомым беларускім паэтам-песеннікам Леанідам Дранько-Майсюком. Гэта стала магчымым дзякуючы бібліятэцы БДУ, а таксама маладзёжным арганізацыям універсітэта. На сустрэчы была арганізавана выстава творчасці паэта — кнігі, публікацыі. Творца чытаў вершы, расказваў пра сябе, раздаваў аўтографы, адказваў на пытанні студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ. Усе засталіся задаволенымі гэтым дыялогам і выказалі спадзяванне, што гэта сустрэча не апошняя ў сценах нашага універсітэта.

*Прэс-служба Студэнцкага Саюза БДУ*

# ЭКАНАМІЧНАЯ І САЦЫЯЛЬНАЯ ГЕАГРАФІЯ

У 1934 годзе ў БДУ на толькі што створаным геаграфічным факультэце ў ліку першых была адкрыта кафедра геаграфіі. Патрабаванні комплекснага падыходу да геаграфічнай адукацыі абумовілі стварэнне ў 1937 годзе і спецыяльнай кафедры эканамічнай геаграфіі. Яе станаўленне звязана з імёнамі запрошаных з Масквы дацэнта У.Я. Зудзіліна і прафесара М.М. Смірнова, якія чыталі курсы лекцый па эканамічнай геаграфіі, праводзілі навуковыя даследаванні па эканамічнай гісторыі і геаграфіі БССР. Для падрыхтоўкі нацыянальных кадраў эканомгеографаў з 1938 года пачала працаваць аспірантура пры кафедры. Прафесар М.М. Смірноў стаў кіраўніком першых у рэспубліцы кандыдацкіх дысертацый па эканамічнай геаграфіі: па геаграфіі ільнаводства ды ільняной прамысловасці БССР (І.І. Трухан), тарфяных рэсурсах і тарфяной прамысловасці БССР (М.Т. Раманоўскі), геаграфіі Брэсцкай вобласці (А.С. Акінчыц).

У пасляваенныя гады кафедра праводзіла шырокія даследаванні народнагаспадарчага комплексу Беларусі, выпускнікі факультэта пашырылі яе кадравы патэнцыял. Загадваў кафедрай з 1950 па 1965 год прафесар, доктар эканамічных навук Н.Е. Рагозін.

У 1968-69 навучальным годзе кафедра эканамічнай геаграфіі была падзелена на дзве: кафедру эканамічнай геаграфіі замежных краін (яе ўзначаліў кандыдат геаграфічных навук, дацэнт М.Т. Раманоўскі) і кафедру эканамічнай геаграфіі СССР (яе ўзначаліў кандыдат геаграфічных навук, дацэнт І.І. Трухан).

У 1992 годзе кафедра эканамічнай геаграфіі СССР атрымала новую назву — кафедра эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці.

Такім чынам, абедзве кафедры эканамічнай геаграфіі разам з геаграфічным факультэтам сёлета адзначаюць 65-годдзе эканамічнай геаграфіі ў БДУ і сваё 30-годдзе.

З першага дня арганізацыі **кафедры эканамічнай геаграфіі Беларусі і краін Садружнасці** і да 1982 года ёю загадваў прафесар **І.І. Трухан.** Пад яго навуковым кіраўніцтвам праводзіліся даследаванні па геаграфіі галін народнай гаспадаркі і рэгіёнаў Беларусі. І.І. Трухан — адзін з аўтараў і сарэдактараў падручніка для ВНУ "Геаграфія Беларусі", які выйшаў у 1977 годзе. З удзелам І.І. Трухана быў створаны навучальны дапаможнік для студэнтаў эканамічных ВНУ "Эканамічная геаграфія БССР" (пад рэдакцыяй С.М. Мельнічука), які вытрымаў 3 перавыданні.




З 1988 года кафедру ўзначальвае **Л.В. Казлоўская**, спецыяліст у галіне рэгіянальнай эканомікі і тэрытарыяльнай арганізацыі гаспадаркі. Акрамя шматлікіх навуковых прац, яна з'яўляецца аўтарам і сааўтарам 15 манаграфій, сярод якіх "Уплыў умоваў і фактараў на эфектыўнасць размяшчэння вытворчасці", "Тэрытарыяльная канцэнтрацыя прамысловасці (эканамічныя і сацыяльныя аспекты)", "Сацыяльная інфраструктура — вынік і фактар эфектыўнасці грамадскай вытворчасці", "Рэгіянальныя праблемы развіцця інфраструктуры і міжгаліновых вытворчасцей". Л.В. Казлоўская як навуковы кіраўнік і адказны выканаўца прымала ўдзел у распрацоўцы шэрага буйных рэспубліканскіх праграм. Вучэбна-выхаваўчую і навуковую работу шмат гадоў вёў на кафедры прафесар **А.Я. Малышаў** — спецыяліст па геаграфіі транспартнага комплексу, даследчык гаспадаркі Палесся, шматгадовы прарэктар Белдзяржуніверсітэта. Свае веды і педагагічны талент аддавалі выхаванню студэнцкай моладзі ветэраны кафедры **А.С. Акінчыц, В.П. Барадзіна, Г.В. Анічэнка**. І сёння працуюць **Н.І. Жураўская** (вядомы спецыяліст у галіне геаграфіі сельскай гаспадаркі), **Л.А. Паўловіч** (даследчык праблем развіцця прамысловых вузлоў Беларусі), якая на працягу шасці гадоў кіравала кафедрай. Выхаванцам кафедры эканамічнай геаграфіі з'яўляецца і прафесар, заслужаны работнік народнай адукацыі **Р.А. Жмойдзяк** — вядомы спецыяліст па геаграфіі сельскай гаспадаркі і эканамічнай картаграфіі, які шмат гадоў узначальваў геаграфічны факультэт.

На працягу амаль 25 гадоў працаваў на кафедры доктар педагагічных навук, прафесар **С.І. Сідар.** Найбольш вядомая яго манаграфія — "Сацыяльна-эканамічная геаграфія СССР: навука і вучэбная дысцыпліна", па якой была абаронена доктарская дысертацыя. Ужо каля 10 гадоў школьнікі Беларусі вывучаюць геаграфію сваёй краіны па падручніку С.І. Сідара. Ён з'яўляецца (у шэрагу сваіх калег па кафедры) адным з аўтараў і складальнікаў "Хрэстаматыі па эканамічнай геаграфіі БССР", энцыклапедычнага даведніка для школьнікаў "Геаграфія Беларусі". С.І. Сідар кіраваў аўтарскім калектывам па распрацоўцы геаграфічнай адукацыі ў школах Беларусі, быў адным са стваральнікаў і намеснікам галоўнага рэдактара часопіса "Геаграфія: праблемы выкладання".

Плённа працуе група выхаванцаў кафедры: дацэнты **Г.С. Смалякоў**, які займаецца праблемамі тэрытарыяльнай арганізацыі сельскай мясцовасці і працуе над доктарскай дысертацыяй па тэарэтычных праблемах сучаснай сацыяльна-эканамічнай геаграфіі; **У.У. Некрыш** — спецыяліст па галіновай і тэрытарыяльнай структуры харчовай прамысловасці Беларусі; **В.П. Сідарэнка** — спецыяліст па праблемах развіцця і размяшчэння нафтахімічнай прамысловасці.

# ВА УНІВЕРСІТЭЦКАЙ АДУКАЦЫІ

Вялікую нагрузку па правядзенню семінарскіх і практычных заняткаў маюць старшыя выкладчыкі кафедры **Т.Л. Казакова і В.М. Корзун**. 30 гадоў працуе на кафедры старшым лабарантам **Л.І. Серафімовіч.** Завяршае навуковую стажыроўку ў Японіі старшая лабарантка, аспірантка-завочніца **К.В. Вусава**.

Сучасны навучальны працэс ва універсітэце шырока абапіраецца на глыбокія навуковыя даследаванні. Так, за апошнія гады калектывам кафедры выкананы даследаванні па абгрунтаванню комплекснага развіцця і размяшчэння прадукцыйных сіл Беларускага Палесся; праведзены дэтальны аналіз спецыялізаваных аграпрамысловых комплексаў; праведзена сацыяльна-эканамічная ацэнка тэрыторыі Беларускага Паазер'я. Даследаваны праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі і яе рэгіёнаў ва ўмовах пераходнай эканомікі і паказаны магчымасці сацыяльна-эканамічнай геаграфіі ў вызначэнні шляхоў іх вырашэння. Абгрунтаваны падыходы да ацэнкі вытворчага патэнцыялу рэспублікі, яе эканоміка-геаграфічнага і геапалітычнага становішча, сфармуляваны накірункі структурнай перабудовы эканомікі рэспублікі, прыярытэты рэгіянальнай палітыкі.

Пасля падзелу кафедры эканамічнай геаграфіі ў 1968 годзе кафедру эканамічнай геаграфіі замежных краін узначаліў вядомы вучоны-географ **Мікалай Тарасавіч Раманоўскі**, які з 1947 па 1983 гады з невялікімі перапынкамі на працягу 30 гадоў быў дэканам геаграфічнага факультэта. Доктар эканамічных навук, прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы. М.Т. Раманоўскі — вядомы навуковец, буйны спецыяліст у эканамічнай геаграфіі прамысловасці, прафесійны педагог. У 1970 годзе ён абараніў доктарскую дысертацыю па гісторыі развіцця мануфактурнай прамысловасці ў Беларусі. А за час працы падрыхтаваў падручнікі па эканамічнай геаграфіі для вышэйшай школы і вялікую групу аспірантаў, якія працуюць у навучальных і навуковых установах рэспублікі. Пры яго непасрэдным удзеле былі створаны новыя кафедры і навукова-даследчыя лабараторыі, якія паспяхова працуюць на факультэце і па сённяшні дзень.

У 1986 годзе кафедру ўзначаліў доктар эканамічных навук **А.У. Тамашэвіч** — вядомы спецыяліст у галіне эканомікі выкарыстання прыродных рэсурсаў і размяшчэння вытворчых сіл. Ён вядзе вялікую навукова-арганізацыйную працу: старшыня спецсавета па абароне доктарскіх дысертацый па геаграфічных навуках пры БДУ, член рэдакцыйных калегій часопісаў “Белорусский экономический журнал”, “Природные ресурсы”, “Веснік БДУ”, член экспертнага Савета па экалогіі і прыродакарыстанню ДКНТ РБ.

Шмат гадоў выхаванню кадраў эканамічнай геаграфіі аддалі дацэнт **У.А. Навіцкі** — выхаванец Ленінградскага універсітэта, старшыя выкладчыкі **М.А. Майракаў, Т.А. Кузьміна, І.Б. Белавусава.**

Вялікі ўклад у станаўленне навуковага накірунку па дэмаграфіі і геаграфіі насельніцтва ўнесла дацэнт **Браніслава Адольфаўна Манак** — выпускніца геафака БДУ, якая на кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін працуе больш 30 гадоў. Яна заснавала лабараторыю рэгіянальных дэмаграфічных праблем пры кафедры і сёння з'яўляецца актыўным членам рэспубліканскіх і міжнародных саветаў і камісій па народанасельніцтву, кансультантам Прадстаўніцтва ААН у Беларусі па праблемах народанасельніцтва.

Адным са старэйшых работнікаў кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін з'яўляецца дацэнт **Фёдар Сяргеевіч Фешчанка** — высокакваліфікаваны спецыяліст у галіне эканамічнай эфектыўнасці і тэрытарыяльнай арганізацыі перапрацоўчых галін АПК, які больш за 40 гадоў вядзе таксама навукова-метадычную работу па развіццю турызму і краязнаўства ў Беларусі. Ён ініцыятар і непасрэдны арганізатар адкрыцця ў БДУ ў 1975 годзе спецыялізацыі па краязнаўству і методыцы турысцка-экскурсійнай работы.

Плённа працуюць на кафедры яе выхаванцы: **І.І. Пірожнік** — доктар геаграфічных навук, прафесар, які у 1993 годзе абараніў доктарскую дысертацыю па тэме “Сацыяльна-геаграфічныя тэндэнцыі развіцця і тэрытарыяльнай арганізацыі турыстычнага абслугоўвання” ў Ягелонскім універсітэце (г. Кракаў); дацэнты **У.М. Зайцаў**, які займаецца праблемамі арганізацыі прыгарадных зон гарадоў; **Н.А. Сцепанюга** — спецыяліст па рыначнай эканоміцы і гаспадаркі замежных краін; **Т.А. Федарцова** — вядомы навуковец па тэорыі экскурсійнай справы, прэзідэнт Беларускай асацыяцыі экскурсаводаў; **І.В. Загорац** — даследчык геаграфіі гарадоў, **К.А. Анціпава** — кіраўнік студэнцкай НДЛ і даследчык знешнеэканамічных сувязей Рэспублікі Беларусь, а таксама старшы выкладчык **Н.Ф. Варанкова**, якая вывучае сучасныя экалагічныя праблемы развіцця вытворчасці. На працягу многіх гадоў аб арганізацыі штодзённа клапаціліся лабаранты **Я.А. Бубліс** і **В.Ф. Клімаў.**

Для забеспячэння навучальнага працэсу па спецыялізацыях: геаграфія сусветнай гаспадаркі, дэмаграфія, краязнаўства і турызм — на кафедры выкананы комплексныя даследаванні сацыяльных, эканамічных і палітычных пераўтварэнняў у сусветнай гаспадарцы і ў асобных замежных краінах. Распрацаваны навуковыя асновы кіравання ўзнаўленнем прыродна-рэсурснага патэнцыялу Беларусі ва ўмовах пераходу да рыначнай эканомікі. На канкрэтных матэрыялах асобных рэгіёнаў і галін гаспадаркі выкананы аналіз розных варыянтаў гаспадарчага асваення тэрыторыі з пункту гледжання рэсурсных магчымасцей, абгрунтаваны крытэрыі эканоміка-геаграфічнага раніравання ў новых умовах. Дадзена ацэнка стану і дынамікі развіцця сучасных працэсаў унутранай і знешняй міграцыі насельніцтва рэспублікі пад уплывам сацыяльна-эканамічных і экалагічных фактараў, даследаваны прычыны і магчымыя наступствы негатыўных станаў ва ўмовах пераходнай эканомікі. Распрацавана канцэпцыя прасторава-функцыянальнага аналізу галіны турысцкага абслугоўвання і праведзены комплексныя эканоміка-геаграфічныя даследаванні прыродна-рэкрэацыйнага і экскурсійнага патэнцыялаў краін СНД і Рэспублікі Беларусь. Абгрунтаваны практычныя рэкамендацыі па ўдасканаленню выкарыстання курортна-рэкрэацыйнага і турыстычнага патэнцыялаў асобных рэгіёнаў Беларусі, пашырэнню фонду рэкрэацыйных тэрыторый і нацыяльных паркаў.

Сваю будычыню кафедры бачаць ва ўдасканаленні зместу і метадаў выкладання дысцыплін сацыяльна-эканамічнай геаграфіі, у даследаванні сучасных праблем сацыяльна-эканамічнай геаграфіі Беларусі і замежных краін, у павышэнні кваліфікацыйнага ўзроўню выкладчыкаў, і галоўнае ў павышэнні ўзроўню і якасці падрыхтоўкі спецыялістаў-географаў.

*Л.В. КАЗЛОЎСКАЯ,*
*загадчыца кафедры эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці, доктар эканамічных навук, прафесар*

*А.У. ТАМАШЭВІЧ,*
*загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін, доктар эканамічных навук, прафесар*

*Фотаздымак з архіва геаграфічнага факультэта*

# БЕЛАРУСКІ ГЕРЦЭН



У сакавіку гэтага года спаўняецца 150 год з дня смерці Аляксандра Хрыстафоравіча Незабытоўскага — славутага, але доўгі час ананімнага пісьменніка і публіцыста, апантанага вандроўніка. Нарадзіўся ён 2 кастрычніка 1819 года ў маёнтку Смалічы Слуцкага павета Мінскай губерні (цяпер Нясвіжскі раён) у сям'і багатага памешчыка. Бацька займаў пасаду прэзідэнта Мінскага губернскага межавага суда і памёр у 1826 — на 40-м годзе жыцця. З 1827 года Аляксандр вучыўся ў Варшаве ў французскім пансіёне Шапэна, праз два гады быў пераведзены ў пансіён Кастля і заканчваў вучобу ў пансіёне Пашкоўскага. Пра варшаўскі перыяд ён потым напіша ў мемуарах, што "добра ведаў геаграфію і гісторыю". У 1835 годзе Аляксандр паступіў на матэматычны факультэт Дэрпцкага універсітэта, які закончыў праз тры гады. Потым служыў у канцылярыі Ігуменскага павятовага маршалка і губернскім сакратаром у Мінску. Пасля звальнення жыў у маёнтку Лапічы Ігуменскага павета і займаўся літаратурнай працай — за кароткі час ён падрыхтаваў для друку шэраг артыкулаў на грамадска-палітычныя тэмы, кнігу мемуараў, раман і чатыры драмы.

У 1844-1847 гадах ажыццявіў падарожжа, каб авалодаць замежнымі мовамі і пазнаёміцца са славутымі мясцінамі Заходняй Еўропы (Аўстрыя, Італія, Францыя, Іспанія, Партугалія, Англія, Швейцарыя), Міжземнамор'я і Егіпта. У верасні 1844 года з Кракава паехаў чыгункаю ў Вену, адтуль — у Італію (Трыест, Венецыя, Фларэнцыя, Рым, Неапаль). У лютым 1845 года наведаў Сіцылію, у сакавіку зноў вярнуўся ў Неапаль, адкуль на караблі паплыў у Марсель, потым праз Пірэнейскія горы падаўся ў Мадрыд; у Іспаніі пабачыў Барселону, Сарагосу, Гранаду, Гібралтар, Севілью і Кадзіс. У ліпені — ён ужо ў Лісабоне, з Партугаліі морам паплыў у Лондан і прабыў там паўгода. У пачатку 1846 года трапіў у Парыж, адтуль — у Жэневу і зноў у Італію (Мілан, Турын, Рым, Неапаль). Восенню морам паплыў у Грэцыю (Афіны, Карынф, Спарта) і потым у Егіпет — Александрыю. Пабачыў піраміды егіпецкіх фараонаў. Зіму з 1846 на 1847 год праляжаў хворым у Каіры. На зваротнай дарозе ў Італію наведаў востраў Мальту. На радзіму Незабытоўскі вярнуўся летам 1847 года праз Венецыю, Вену і Кракаў. Як бачым, ён ажыццявіў вельмі складаны і інтэўсіўны маршрут, і гэта, безумоўна, была вельмі напружаная вандроўка захаплядьнага і мэтанакіраванага падарожніка. І ўвесь гэты час ён вёў асабісты дзённік — "Падарожныя запіскі", у якія запісваў свае ўражанні.

За мяжой Незабытоўскі цікавіўся гістарычнымі помнікамі, наведваў музеі, вывучаў італьянскую, іспанскую, англійскую, грэчаскую і нават арабскую мовы; французскую і нямецкую мовы ён ведаў дасканала і пазней у лісце да сваёй сястры адзначыў, што "добра выхаваны мужчына павінен знаць не менш за сем моваў". Безумоўна, яму хацелася пабачыць славутыя мясціны Міжземнамор'я і авалодаць на практыцы замежнымі мовамі, але ён хацеў перш за ўсё надрукаваць за мяжой свае рукапісы — выказаць свае погляды на актуальныя грамадскія праблемы (у Расійскай імперыі гэта было немагчыма). У Парыжы ён ананімна выдаў 5 кніг (2 былі выдадзены ў Вільні — драмы "Разамунда" і "Барбара"), у якіх акрамя геаграфічных нарысаў асвятляў нацыянальна-вызваленчую барацьбу прыгнечаных народаў царскай Расіі: у Парыжы — "Мае запіскі", "Міцкевіч. Славянскія літаратуры", "Мары пра каханне, славу і свабоду", драма "Ядвіга" і драма "Кацярына Вялікая".

Мемуары "Мае запіскі" складаюць успаміны Незабытоўскага — вучня варшаўскіх прыватных пансіёнаў, якія пачынаюцца са слоў: "Пішу не запіскі нашай эпохі, але толькі ўласныя ўспаміны, не гісторыю народа, але толькі свае мемуары, не палітычны ці дыпламатычны трактат, але толькі біяграфію". Але ўсё гэта вельмі ўмелы аўтарскі прыём, які дазваляе аўтару выказаць свае асабістыя адносіны да рэвалюцыйных падзей 1830-1831 гадоў; дарэчы, у гэтых мемуарах Незабытоўскі называе сябе ліцвінам (беларусам). У таленавітай невялікай кнізе "Міцкевіч. Славянскія літаратуры" (Парыж, 1845), прысвечанай крытычнаму агляду лекцый свайго куміра ў Калеж дэ Франс, аўтар выступае супраць славянафільскіх ідэй Адама Міцкевіча і сцвярджае, што Міцкевіч — не прарок, а толькі геніяльны паэт, Вялікі Паэт. Багатая і разнастайная творчая спадчына Незабытоўскага, дзе ён выступае не толькі як празаік і драматург, як крытык і публіцыст, але і як гісторык, філосаф і сацыёлаг, — гэта спадчына перадавога мысліцеля на ўзроўні Герцэна.

За спробу перавезці з-за мяжы нелегальныя выданні, у тым ліку і свае "Падарожныя запіскі", Незабытоўскі быў арыштаваны і засуджаны па загаду цара Мікалая І да 20-гадовай катаргі ў сібірскіх рудніках, з пазбаўленнем дваранскіх і маёмасных правоў; кат павінен быў зламаць над яго галавой шпагу. Так у Расіі судзілі толькі дзекабрыстаў і петрашэўцаў — самых небяспечных дзяржаўных злачынцаў. І, відаць, было за што царскім уладам баяцца гэтага вальнадумца: Незабытоўскі меў звыш 900 душ прыгонных сялян у сваіх маёнтках Смалічы і Лапічы, але рашуча выступаў за скасаванне паншчыны. За ўсе рукапісныя і друкаваныя (ананімныя) творы, якія аказаліся пры Незабытоўскім на аўстрыйскай мяжы ў момант яго арышту летам 1847 года, ён быў прызнаны ў наступных "злачынствах": у знявазе імператара і іншых высокіх асоб самымі дзікімі лаянкамі, у лютай ненавісці да ўраду з пошукамі сродкаў для яго знішчэння, у падрыхтоўцы да друку заклікаў узбунтваць польскія правінцыі (Беларусь і Літву) з мэтай адарваць іх ад расійскага ўладарання, у сувязях з польскімі выгнаннікамі за мяжой і захоўванні кніг польскай прапаганды ў Парыжы злачыннага зместу і нават у знявагах святасці хрысціянскай веры. А за словы ў Расіі Мікалая І, як казаў Аляксандр Герцэн, каталі "больш жорстка, чым за справу".

Незабытоўскі памёр да выканання прысуду ў Віленскай цытадэлі (21 сакавіка 1849 года) і 25 сакавіка быў пахаваны на ваенных шпітальных могілках Вільні; у турме ён знаходзіўся ў адзіночнай камеры № 13 былога дамініканскага кляштара, дзе калісьці сядзелі Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, Ян Чачот і іншыя філаматы, а пазней Ш. Канарскі і Ф. Савіч.

Лёс А. Незабытоўскага склаўся трагічна — яго, хворага, доўга трымалі ў адзіночнай камеры і згнаілі ў дамініканскіх мурах у Вільні. Не пашанцавала і яго кнігам, якія былі выдадзены ананімна і толькі праз дзесяцігоддзі стараннямі С.Х. Александровіча (1975) набылі сапраўднае аўтарства. Яшчэ горшая доля напаткала яго рукапісы, цікавыя для геаграфічнай навукі: большая іх частка загінула ў час следства.

***В. А. ЯРМОЛЕНКА, доктар геаграфічных навук***

# ДЛЯ ЎСІХ СІМПАТЫЧНЫХ ДЗЯЎЧАТ

Ансамбль "Глорыя", які базіруецца ў ліцэі Белдзяржуніверсітэта, — даволі вядомы танцавальны калектыў у Мінску. Нягледзячы на свой яшчэ зусім малады ўзрост — толькі тры гады актыўнай творчасці — ён ужо мае тры дыпломы. Гэта дыплом ад выставачнага таварыства "Экспафорум", дыплом фестывалю народнай творчасці "Сузор'е-97", і апошнюю ўзнагароду "Глорыя" атрымала зусім нядаўна на Першым фестывалі народнага мастацтва Беларусі "Беларусь — мая песня".

Задумвалася "Глорыя" як калектыў бальных танцаў. Але партнёрства ў бальных танцах — рэч даволі складаная. Узнікаюць узаемныя інтарэсы, сімпатыі. Калі ж гэтыя адносіны становяцца халоднымі, вельмі цяжка працягваць танцаваць так жа сама ўзнёсла. І яшчэ была адна праблема ў бальнай студыі — невялікая колькасць хлопцаў. Але выйсце знайшлі: калектыў стаў эстрадным. Тады нарадзілася і назва. "Глорыя" — адзін з першых танцаў. Само ж слова з іспанскай мовы перакладаецца як ззянне. А дзяўчаты ўсе прыгожыя, магчыма, таму і спыніліся менавіта на "Глорыі". У рэпертуар таксама ўваходзяць танцы дыска, вальс, арабскі і іншыя.

Танцавальная праграма ў калектыву даволі насычаная. У сярэднім — адно выступленне ў тыдзень. Перад святамі, вядома, часцей. На Новы год выступалі дзесяць дзён запар па аднаму, а то і па два разы на дзень. Такі рытм вытрымае толькі чалавек, пасапраўднаму апантаны танцамі.

Некаторыя выступленні не абыходзіліся без казусаў. Бывала, што дзяўчаты не паспелі пераапрануцца і выбегалі на сцэну хто ў чым, а аднойчы штосьці здарылася з апаратурай і перастала граць фанаграма: давялося дзяўчатам дзве трэці свайго выступлення заканчваць пад бурныя апладысменты залы.

У ансамбля шмат творчых планаў. Зараз "Глорыя" можа выступаць толькі ў пары з іншым калектывам ці спеваком, таму што ўсе танцы масавыя, а каб пераапрануцца — трэба час. У бліжэйшай будучыні ансамбль плануе прадставіць сольную праграму, для якой спатрэбіцца шмат людзей. Таму для ўсіх сімпатычных дзяўчат ростам 160-168, знаёмых з харэаграфіяй, у "Глорыі" адчынены дзверы.

Цяжка давялося б калектыву, калі б не дапамога дырэктара ліцэя Генадзя Уладзіміравіча Пальчыка. Дзяўчаты нават называюць яго сваім хросным бацькам. Калі б не ён, то не было б у ансамбля такіх прыгожых касцюмаў.

Пра касцюмы трэба сказаць некалькі слоў асобна. Іх не распрацоўваў ніякі мадэльер. Усе фасоны прыдуманы самімі дзяўчатамі. Яны ж самі пазней ужо гатовыя сукенкі расшываюць бліщчынкамі.





*На фотаздымках:* малодшая група ансамбля "Глорыя";

першы склад "Глорыі", стаяць: Інга Смоліч, Ганна Шатанёнак, Аляксей Нежавец, Вольга Гусянец (мастацкі кіраўнік), Дзмітрый Адзярыха, Ірына Касухіна, Людміла Дубоўская; сядзяць: Паліна Ціванова, Вольга Лягчылава.

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

---

САКРЭТ ФІРМЫ

## У ГРОДНА З'ЯВІЦЦА ЭКАЛАГІЧНАЯ КАРТА

Свая карта ёсць у кожнага горада. Але экалагічнай, у адрозненне ад Варшавы, Казані, Харкава, няма нават у Мінска. А першая такая карта ў Беларусі з'явіцца, верагодна, у Гродне.

Восемдзесят шэсць працэнтаў гараджан, якія прынялі ўдзел у сацыялагічным апытанні, пажадалі мець яе. Апытанне праводзілі спецыялісты Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы. Затым на факультэце біялогіі і экалогіі стварылі часовы творчы калектыў "Эколагхім-бія". Ён і распрацоўвае тэму "Эколага-таксікалагічнае раяніраванне Гродна", якая фінансуецца з дзяржбюджэту. У рамках гэтай праграмы будуць вызначаны нарматывы гранічных антрапагенных нагрузак. Іначай кажучы, стане зразумела, да якой мяжы гродзенцы могуць без шкоды ўплываць на прыроду.

Як паведаміла дэкан факультэта біялогіі і экалогіі Наталля Паўловіч, у гэтым навучальным годзе пачалася падрыхтоўка бакалаўраў, а таксама адбудзецца першы выпуск спецыялістаў-эколагаў.

*Па матэрыялах газеты "Рэспубліка"*

**ТЭСТ**

# Куды і на што мы трацім свой час?

*На гэта пытанне ніхто з нас дакладна адказаць, напэўна, не зможа.*
*Але адно мы ведаем: час на штосьці траціцца, яго катастрафічна не хапае.*

Французскія даследчыкі, вывучыўшы асаблівасці сучаснага ладу жыцця, падлічылі, як размяркоўваецца час сярэднестатыстычнага еўрапейца за 70 гадоў жыцця. Згодна з іх разлікамі, за гэты тэрмін нам даводзіцца:

стаяць — 30 гадоў
спаць — 23 гады
сядзець — 17 гадоў
хадзіць — 16 гадоў
працаваць (выконваць прафесійныя абавязкі) — 8-9 гадоў
есці — 6-7 гадоў
бачыць сны — 4 гады
ездзіць у гарадскім транспарце — 3 гады
(у вялікіх гарадах — 6 гадоў)
гаварыць і слухаць іншых — 2 гады
глядзець тэлевізар — больш як 6 гадоў
смяяцца — 623 дні
гатаваць ежу — 560 дзён
фліртаваць з супрацьлеглым полам — 504 дні
бегаць па магазінах — 440 дзён
хварэць — 420 дзён
вучыцца ў школе (у адпаведнасці з устаноўленым мінімумам) — 405 дзён
адзначаць святы — 375 дзён
запаўняць розныя афіцыйныя паперы — 305 дзён
чытаць — 250 дзён
размаўляць па тэлефоне — 180 дзён
апранацца:
мужчыны — ад 177 дзён
жанчыны — ад 531 дня
стаяць у чарзе — 140 дзён
мыцца:
мужчыны — ад 177 дзён
жанчыны — да 2 гадоў
займацца любоўю — 110 дзён
прычэсвацца — 108 дзён
спраўляць малую патрэбу — 106 дзён
чысціць зубы — 92 дні
праводзіць эпіляцыю (жанчыны) — 72 дні
спраўляць вялікую патрэбу — 53 дні
плакаць — 50 дзён
вітацца:
пастухі — ад 8 дзён
урачы і святары — да 30 гадоў
запаўняць падатковую дэкларацыю — 3-6 дзён
глядзець на гадзіннік — 3 дні.

Цяпер, калі мы ведаем, куды трацім свой час, будзем размяркоўваць яго больш рацыянальна.

**А Ў НАС І А Ў ВАС?**

## ПЕРШЫЯ ПА КОЛЬКАСЦІ ПАЦАЛУНКАЎ

14 лютага Беларусь упершыню выйшла на сусветны рэкорд, варты амаль што самага тыражнага выдання планеты — "Кнігі рэкордаў Гінеса". Больш за 6 тысяч маладых юнакоў і дзяўчат удзельнічалі ў самым масавым пацалунку на планеце. З гэтым "цёплым" рэкордам Беларусь і ўвайшла ў гісторыю чалавецтва.

## САМАЯ СТАРАЖЫТНАЯ ПРАЯВА КАХАННЯ

А што ж сам пацалунак? Без перабольшання можна лічыць яго справай навуковай. Часцей за ўсё даследавалі гэты аб'ект самай старажытнай праявы кахання мастацтвазнаўцы і сацыёлагі. Але ж не заставаліся ўбаку і прадстаўнікі прыродазнаўчых галін ведаў: біёлагі, хімікі, нават матэматыкі.

Напрыклад, менавіта навукоўцы паведамілі пра адну з самых нерамантычных акалічнасцей: падчас пацалунку адбываецца абмен 60 міліграмамі сліны, якая ўтрымлівае сем дзесятых міліграмаў бялку, столькі ж тлушчу і каля 300 тысяч розных бактэрый. Што ж датычыць гісторыі ўзнікнення такой формы зносін, то большасць даследчыкаў схіляецца да таго, каб лічыць яго першай праявай звычку птушак і некаторых жывёл карміць сваіх дзетак з рота ў рот. Дарэчы, сярод сусветна прызнаных навуковых знаўцаў пацалунку толькі адна жанчына — амерыканка Эдрыен Блю, якая напісала кнігу "Пацалунак, ці Чаму мы не можам адарвацца адзін ад аднаго".

Старажытныя рымляне адрознівалі тры віды пацалункаў: "оскулум" — пацалунак, якім абменьваліся сябры, каб прывітаць адзін аднаго, "саавіум" — імгненны пацалунак у вусны і, нарэшце, "базіум" — пацалунак жадання. Звычай цалавацца рымляне атрымалі ў спадчыну ад старажытных грэкаў, якія дадаткова падчас пацалунку бралі адзін аднаго за мочкі вушэй, трымаючы такім чынам галаву партнёра, як рондаль за дзве ручкі. Адсюль і грэчаская назва пацалунку — "кітра", гаршчок.

У некаторых афрыканскіх плямён і да гэтага часу пацалунак, як у дагістарычныя часы, служыць выражэннем шанавання і пакланення. У іх захаваўся звычай цалаваць зямлю, камяні, дрэвы. Хрысціяне, дарэчы, таксама ж цалуюць ногі мармуровых мадон, абразы, ёмістасці, у якіх захоўваюцца мошчы святых. У сярэднявеччы пацалунак быў часткай прыдворных рытуалаў. Рытуал сустрэчы Рымскага Папы Стэфана IV з каралём Людовікам I Святым, якая адбылася 5 кастрычніка 816 года, прадугледжваў прыкладна паўгадзінны абмен пацалункамі: у лоб — сімвал розуму, вочы — бо яны няспынна назіраюць за сцвярджэннем справядлівай справы, грудзі — у іх б'ецца адданае Хрысту сэрца, вусны — бо нясуць слова Збаўцы.

## КЛУБ РЭКАРДСМЕНАЎ

Сетка клубаў-рэкардсменаў раскідана па ўсім свеце. Усяго такіх аб'яднанняў налічваецца больш за трыццаць. Іх задача — збіраць інфармацыю пра рэкорды. Галоўнае адрозненне расійскага "Інтэрстронга", прэзідэнт якога Алег Гаруноў прыязджаў у Мінск спецыяльна для рэгістрацыі беларускага рэкорда, ад іншых у тым, што масквічы не толькі даведваюцца пра рэкорд і папаўняюць сусветную базу дадзеных, але ў большасці выпадкаў і самі займаюцца вытворчасцю рэкордаў.



Калі ставіцца рэкорд, неабходна, каб падчас дзейства прысутнічала якая-небудзь незалежная камісія. Яна рэкорд і рэгіструе. На працягу ўсяго вечару пацалункаў 50 байцоўпамочнікаў запаўнялі спецыяльныя пратаколы, па якіх і падлічвалася колькасць пар тых, хто цалаваўся. Дарэчы, працэнт пагрэшнасці заўсёды дапускаецца, але лічба гэтая не павінна перавышаць 1 працэнт.

## КНІГА РЭКОРДАЎ

Першая кніга рэкордаў пабачыла свет у 1954 годзе ў выглядзе бюлетэня пад гандлёвай маркай карпарацыі "Гінес", якая да таго ж вядомая сваім півам. Па легендзе, калісьці кампанія ірландскіх паляўнічых не змагла вырашыць спрэчку адносна самай хутканогай птушкі, на якіх яны палююць. А потым высветлілася, што неабходнага даведніка "самых-самых" наогул не існуе. Вось так звычайны бюлетэнь стаў бестселерам, а потым і сусветна вядомай кнігай, трапіць у якую за шчасце палічыў бы кожны, хто жыве на Зямлі. Гэтая незвычайная кніга пашырае межы ўяўленняў людзей пра магчымасці чалавека: фізічныя, інтэлектуальныя ці якія-небудзь іншыя.

Многія лічаць, што кожнаму, хто паставіў свой рэкорд, "Кніга рэкордаў Гінеса" выплочвае грашовую ўзнагароду. Але аказваецца, што штаб-кватэра ў Лондане нікому нічога не плаціць. А вось за права выпуска Кнігі рэкордаў кожны павінен пералічыць вызначаную суму. З іншага боку, у кожнай краіне існуюць прызавыя фонды для нацыянальных рэкардсменаў. Яны ўзнікаюць з прыбытку, атрыманага за кошт продажу кнігі.

Да гэтага часу 80 працэнтаў інфармацыі, змешчанай на старонках "Кнігі рэкордаў Гінеса", — гэта дасягненні Англіі і ЗША. Але прыйшоў, відавочна, і наш час.


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*
*Ум. друк. арк. 1*
*Падпісана ў друк у 12.00*

25 ЛЮТАГА
Зак. 144.
Т. 1000 экз.

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 3, пакой 307, тэлефон 2206827.*

**Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка А. Крывадубскай*